Нашы прагнозы ў дачыненні да лёсу кніжнай культуры Беларусі аптымістычныя: кніга захавае сваё значэнне ў грамадстве, культуры і адукацыі, хаця імклівы навукова-тэхнічны працэс не дазваляе ўпэўнена сказаць, у якой форме гэта будзе адбывацца. Хутчэй за ўсё далейшае развіццё атрымае электронная (віртуальная) кніга. Многія звязваюць свае надзеі з "новай архаікай" кнігі, а менавіта з рунічнай кнігай. Галоўнае тое, што ў любым выпадку яна захавае характэрную ёй прыроду. На зыходзе XX ст. мы назіраем толькі чарговае пераўвасабленне кнігі, як тысячагоддзі таму назад папірус і пергамент прыйшлі на змену гліняным таблічкам, а на змену рукапіснай кнізе з'явілася друкаваная. Кніга ўцягнута ў глабальныя працэсы інфарматызацыі і візуалізацыі грамадства і культуры. У галінах як традыцыйнай, так і нетрадыцыйнай кнігі сёння надаецца вялікая ўвага форме (напрыклад, у з'яве paperbacks), а таксама адпаведнасці запытам чытачоў. Можна сказаць, што паміж кнігай і чалавекам сёння "ідзе актыўны дыялог", у выніку якога кніга вучыць чалавека, а той фарміруе патрэбную яму кнігу.

1. *Григорьянц Е.И.* Книга в культуре. —СПб., 1993.
2. *Эскарпи Р.* Революция в мире книг. —М., 1972.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ю.В.Чарняўская,**
*ст. выкладчык*

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ КУЛЬТУР ЯК ШЛЯХ ДА АДЗІНАГА ЧАЛАВЕЦТВА

Вялікі філосаф XX ст. М.Бубер сцвярджаў, што светам культуры кіруюць адносіны "я— ты". Выдатны мысліцель М.Бахцін падкрэсліваў, што аснову і сутнасць культуры складае дыялог. Апошні абумоўлівае не толькі мову, але ж і саму магчымасць мыслення, паколькі кожная ідэя заўсёды ўзнікае ў адказ на іншую, існуе толькі "ва ўмовах жывога кантакту з чужой думкай, увасобленай у чужым голасе, у чужой, выяўленай у слове свядомасці. У пункце гэтага кантакту галасоў-свядомасцей і нараджаецца і жыве ідэя" (1, с. 147). Такі (не абавязкова выяўлены вонкава) дыялог М.Бахцін называе "мікрадыялогам". Мікрадыялог — умова камунікацыі чалавека з сабой і іншым

чалавекам, як рэальным, так і такім, які прысутнічае нябачна: у такога роду дыялог мы ўступаем, напрыклад, сустракаючыся з творам мастацтва і, значыць, з яго творцай. Пры дапамозе мікрадыялога ажыццяўляецца дыяхронная сувязь членаў этнасу (пераемнасць).

Іншы полюс дыялога — макрадыялог. Калі мікрадыялог разгортваецца ў свядомасці чалавека і этнасу, то макрадыялог з'яўляецца ўмовай камунікацыі культур. "...Разуменне кожнай культуры... як суразмоўцы, як аднаго з удзельнікаў дыялога па "апошніх пытаннях чалавечага быцця" — такога ўдзельніка, які ў адносінах з іншымі вобразамі культуры выяўляе і ўпершыню фарміруе новыя свае сэнсы, формы, імкненні, да гэтага іншага вобраза накіраваныя, — такое разуменне і зводзіць разам усе азначэнні дыялога як усеагульнай сутнасці гуманітарнага мыслення", — піша В.Біблер.

Паводле М.Бахціна, культура амбівалентна (дваіста), паколькі заўсёды ствараецца на дыялогу "верху і нізу" — смеху і сур'ёзнасці, свяшчэннага і людскога. Паводле В.Біблера, амбівалентнасць азначае таксама здольнасць кожнай культуры "адхіляцца" ад самой сябе, быць здольнай да дыялога з іншымі культурамі.

Чым больш авалодвае чалавечае мысленне вобразамі і дасягненнямі іншых культур, тым яно багацейшае, больш гібкае і дзейснае. Пранікаючы ў "вобраз свету" іншых народаў і культурных эпох, мы перш за ўсё павінны вывучыць своеасаблівы і непаўторны яе склад, а таксама адрозненне ад нашага часу і нашага "вобраза свету". Падыходзіць да культуры іншых краін толькі з пункту гледжання сваёй культуры — значыць надзвычай збядняць гэтую культуру: убачыць культурную своеасаблівасць свайго этнасу можна толькі "ў дыялогу" з культурай іншага этнасу.

Гуманізм канца XX ст. шмат у чым будаваўся не толькі на зацвярджэнні тэзіса аб роўнасці культур, але і на тым, што важнейшы ўклад у паляпшэнне жыцця ў свеце заключаецца ў разнастайнасці формаў, якія гістарычна і ментальна набылі культуры розных народаў. Кожная культура — гэта асобы позірк на свет, але позірк ніколі не зможа ахапіць усю сутнасць з'явы. Поўнае ўражанне і, такім чынам, адносіны да любога быційнага феномена магчымыя толькі пры ўмове, што гэты феномен разглядаецца з розных бакоў. Таму ні адну культуру нельга лічыць узорам, прыгодным для астатніх. Выдатнейшы антрапалаг

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XX ст. К.Леві-Строс сцвярджаў, што здольнасць да працэсу — вынік формы камунікацыі культур і што культура развіваецца толькі ў гэтай камунікацыі, а любая ізаляванасць культур мае сваёй перадумовай застой.

У свой час О.Шпенглер пісаў аб поўнай замкнутасці, непранікальнасці культур. Але ж такой непранікальнасцю, ды і то адноснай, валодаў толькі архаічны свет. Гісторыя чалавечай культуры — гісторыя руху да універсалізму. Сёння мы не ўяўляем сабе мінулае як чаргаванне падзей, якія абумоўліваюць шляхі народаў. Хутчэй мы ўспрымаем яго як чаргаванне і сумеснае існаванне цывілізацый, якія шмат у чым абумоўліваюць характар этнасаў, якія ўваходзяць у іх.

Нягледзячы на гісторыю тэрміна "цывілізацыя", якая пачалася яшчэ ў Старажытным Рыме, яго цяперашняе разуменне пачало складвацца толькі ў XIX ст., калі ён упершыню быў выкарыстаны ў якасці лакальных супольнасцей (мона- ці поліэтнічных), валодаючых ярка выяўленай сацыякультурнай спецыфікай.

Шэраг даследчыкаў лічаць, што фундаментам цывілізацыі з'яўляецца культурная спадчына, таму што працягласць цывілізацыі ў прасторы і яе працягласць у часе базіруюцца на пераемнасці, традыцыі як сінтэзе пераемных пачаткаў і навацый, заўсёднага прыстасавання мінулага да сучаснасці і будучыні. Да фундаментальных прынцыпаў цывілізацыі адносяць прагрэсіруючы падзел працы, а значыць, і падзел сацыяльных функцый, і непазбежнае ў гэтай сувязі сацыяльнае ўзаемадзеянне. Большасць вучоных сцвярджае, што цывілізацыя немагчыма без агульнай рэлігіі і шматнацыянальных дзяржаў, пераемнага накаплення грамадскага багацця і збережэння фундаментальных асноў способу жыцця. У такой шматлікасці меркаванняў, кожнае з якіх дакладнае, лёгка разгубіцца.

Што ж з'яўляецца вядучым прынцыпам, які аб'ядноўвае народы ў грамадныя звышэтнічныя супольнасці — цывілізацыі, ці існуе ён наогул?

Так, існуе. Гэта "прынцып дадатковасці" Н.Бора, сэнс якога — узаемная дапаўняльнасць. "Кожная асобная цывілізацыя з'яўляецца сеткай адносін паміж рознымі элементамі сацыякультурнай сістэмы, у якой адсутнічае адзіны пачатак і якая дапускае розныя формы ўзаемазалежнасці" (3, с. 115). Значыць, вядучым прынцыпам кожнай цывілізацыі з'яўляецца ўзаемадзеянне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узаемадзеянне народаў існуе столькі ж, колькі самі народы. Яно ўключае разнастайныя аспекты: гандлёвыя і культурныя сувязі, палітычныя зносіны аж да каланізацыі і войн і інш. Сетка такіх адносін ніколі не была стабільнай, нязменнай: адны элементы знікалі, на змену ім прыходзілі іншыя, цэнтры цывілізацый зрушваліся, цывілізацыі мянялі межы, нават знікалі, але перадавалі многія свае важнейшыя асаблівасці наступным. Так, грэка-рымская і іудзея-хрысціянская цывілізацыі з'явіліся папярэднікамі і фундаментам сучаснай заходнееўрапейскай.

Цывілізацыі і нават тыя іх адзнакі, якія здаюцца вядучымі ў пэўную эпоху (напрыклад, цэнтр ісламскай цівілізацыі — рэлігія, амерыканскай — індывідуалізм), не застаюцца нязменнымі. Пастаянная толькі сама аснова — прыцягненне народаў да ўзаемасувязі, у працэсе якой яны набываюць шмат у чым агульны светапогляд і разгорнутую сетку адносін.

Такім чынам, можна гаварыць аб тым, што жыццё грамадства грунтуецца на чатырох падсістэмах:

— біясацыяльнай, якая ўключае сям'ю, сваяцтва, адносіны палоў, працу, абарону ад нябяспекі, жыллё, харчаванне;

— эканамічнай, якая ахоплівае вытворчасць і спажыванне, абмен прадуктамі і паслугамі, рынак, тэхніку і тэхналогіі;

— палітычнай, якая ўключае інстытуцыянальныя зносіны паміж людзьмі, значыць, сукупнасць звычаяў, нормаў, улады, права;

— культурнай, якая ўбірае ў сябе ўсе праяўленні духоўнага жыцця членаў соцыуму.

Сукупнае іх узаемадзеянне параджае цэласную сістэму — цывілізацыю. Але вышэйназваныя падсістэмы не раўнапраўны. І палітычнае, і сацыяльна-эканамічнае, і нават біялагічнае як бы "прапускаюцца" праз прызму культурнага светаўспрымання, ментальнасці членаў соцыуму.

Цывілізацыю можна вызначыць як сацыякультурную супольнасць, якая безупынна фарміруе сябе на аснове звышлакальных каштоўнасцей, сэнсаў, уяўленняў, якія атрымліваюць увасабленне ў сусветных рэлігіях, сістэмах маралі, мастацтве, а таксама спосабе жыцця і інстытуцыянальных формах і механізмах сацыяльнай рэгуляцыі народаў, якія ўваходзяць у яе склад.

Цывілізацыя з'яўляецца адзінствам разнастайнага. У гэтай цэласнасці — яе асноўная якасць. "Цывілізацыі з'яўляюцца ў пэўнай ступені інтэграванымі супольнасцямі. Часткі, якія іх

складаюць, узаемадзейнічаюць адна з адной і з цэлым. Калі цывілізацыя складаецца з некалькіх дзяржаў, то гэтыя дзяржавы ў большай ступені звязаны паміж сабой, чым з дзяржавамі ў іншых цывілізацыях. Пры гэтым яны могуць ваяваць і ўступаць у дыпламатычныя зносіны паміж сабой, захоўваць вялікую ступень узаемазалежнасці ў эканамічным плане. Яны стануць больш узаемазалежнымі ў эканамічным дачыненні. У іх будуць існаваць узаемапранікаючыя эстэтычныя і філасофскія плыні" (4, с. 117).

Прынцыповая агульнасць ці падабенства інтарэсаў, якія ўзніклі дзякуючы адзінству гістарычных лёсаў народаў, што жывуць у адным рэгіёне, іх працяглага і цеснага культурнага ўзаемадзеяння, а значыць, падабенства, якое непазбежна ўзнікае ў формах і механізмах іх сацыяльнага быцця (у метадах гаспадарання, палітыцы і праве, рэлігіі, навуцы, мастацтве), і абумоўлівае цывілізацыю. Гэтае падабенства ні ў якім выпадку не абазначае уніфікацыі: этнічны "тып" народа, які ўваходзіць у тую ці іншую цывілізацыю, хаця і не застаецца нязменным, але ж захоўвае своеасаблівыя рысы.

З факта існавання цывілізацый вынікае, што ўзровень чалавечай ідэнтыфікацыі не абмежаваны этнасам ці этнічнай групай. Так, жыхар Мінска можа назваць сябе мінчуком, беларусам, праваслаўным, хрысціянінам, еўрапейцам. Апошняя, бадай што, самая шырокая сфера, у якой ён набывае быццё. Знакаміты амерыканскі палітолаг С.Хантынгтан піша аб гэтым: "Цывілізацыя — гэта самае вялікае "мы", дзе чалавек адчувае сябе ў культурным дачыннені дома, і адначасова тое, што аддзяляе ад усіх "іх" — тых, што па-за" (4, с. 117).

Але ў той жа час Г.Памеранц прапаноўвае звышцывілізацыйны варыянт чалавечай супольнасці, так званую "субэкумену".

Субэкумена — гэта ўстойлівая кааліцыя культур, якія звязаны адзінай рэлігіёзна-філасофскай традыцыяй. Такіх "звышнацыянальных" культур Г.Памеранц налічвае чатыры — заходнехрысціянскую, ісламскую, індуіска-будыйскую і канфуцыянска-будыйскую.

Пачатак субэкумен можна адлічваць з I тысячагоддзя да н. э., калі ўзнікаюць сусветныя рэлігіі, якія ўпершыню ў гісторыі звяртаюцца да кожнага чалавека, які іх прыняў, ігнаруючы яго этнічную прыналежнасць. Тады і зараджаецца ў душах пракрокаў і мысліцеляў ідэя сусветнай цывілізацыі.

Асноўная перадумова такога надэтнічнага, наднацыянальнага руху — парыў да адзінства, які прадвызначае ў першую чаргу адкрытасць у адносінах да чужынцаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Субэкумены могуць быць больш ці менш адкрытымі да чужога. Але ў любым выпадку яны валодаюць уменнем заваёўваць “чужых”, якія ўрываюцца ў іх межы, і прыцягваць іх да сваіх прынцыпаў і каштоўнасцей. Успомнім хаця б манголаў і цюркаў, якія, уварваўшыся на Бліжні Усход, сталі носьбітамі ісламу, ці нашчадкаў гунаў — венграў, якія, захапіўшы частку Еўропы, прынялі хрысціянства і ператварыліся ў еўрапейскі народ.

Адрозненне субэкумены ад этнасу ці нават цывілізацыі заключаецца ў тым, што яна ў значна меншай ступені адмяжоўвае сябе ад іншых і, наадварот, імкнецца да збліжэння групы нацый, нават цывілізацый у нейкае Усечалавецтва, прапаноўваючы свае варыянты такога збліжэння. Такімі “варыянтамі” з’яўляюцца канкрэтныя субэкумены.

Народ — нацыя — цывілізацыя — субэкумена... Гэты чатырохэтапны рух характарызуецца ўсё больш вялікай колькасцю супольнасцей, у якіх знаходзіць сябе сучасны чалавек (можна дадаць да шэрага характарыстык сучаснага мінчука яшчэ адну — “жыхар Захаду”). Думаецца, недалёкі дзень, калі да гэтага пераліку можна будзе дадаць апошнюю характарыстыку — “чалавек свету” ці “грамадзянін чалавецтва”.

У гэтай сувязі ўзнікаюць два пытанні: Чаму, нягледзячы на ўспышкі этнічнай і нацыянальнай самасвядомасці, якія пачасціліся ў канцы тысячагоддзя, вучоныя ўсё часцей гавораць аб адзінай сусветнай культуры? Што ж будзе ўяўляць культура як феномен сусветны, планетарны?

Дзеля адказу на першае пытанне ўспомнім яшчэ раз: мы жывём сёння ў “цесным свеце”, які можна абляцець на рэактыўным самалёце менш чым за суткі. А праз дваццаць гадоў, верагодна, дзеля такога кругасветнага падарожжа нам спатрэбіцца ўсяго некалькі гадзін. Міжнародныя сувязі цяпер настолькі шчыльныя, што сучасныя падзеі аказваюць неадкладнае ўздзеянне не толькі на краіну, дзе яны здарыліся, але ж адбіваюцца на ўсім свеце. Так, падзеі ў Югаславіі шмат у чым змянілі палітычную расстаноўку сіл у Маскве, Вашынгтоне, Парыжы, усхвалявалі фінансавыя колы Цюрыха, Лондана і Франкфурта-на-Майне, выклікалі рэзкія рознагалоссі ў сусветнай грамадскай думцы. Адзіны падыход да іншых народаў у гэтых умовах — павага і талерантнасць.

Большасць сучасных даследчыкаў сходзяцца на тым, што ў апошнюю трэць XX ст. наша грамадства ўступіла ў новую фазу:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яно прайшло праз аграрную і індустрыяльную стадыі і стала інфармацыйным. Гэта інфармацыя мае агульнасусветны характар: няма навуковага адкрыцця ці значнай падзеі ў жыцці якой-небудзь краіны, аб якім ужо праз некалькі гадзін не паведалі б па ўсёй зямлі сродкі масавай інфармацыі. Найярчэйшым феноменам сусветнай інфармацыйнай камунікацыі з'яўляецца сетка Internet, якая робіць магчымымі свабодныя зносіны людзей розных нацыянальнасцей, веравызнанняў і пераканананняў.

З сярэдзіны 50-х гг. усё больш сусветны характар набывае эканоміка. Ужо сёння транснацыянальныя карпарацыі выпрабляюць каля трэці сусветнага прадукту. Цяпер цяжка знайсці краіну, якая мае ізаляваную нацыянальную вытворчасць і тым больш спажыванне. У гэтай сувязі паказальная падзея — увядзенне на тэрыторыі Еўропы адзінай валюты (так званай "еўра"). Буйнейшая прычына такіх змен у эканоміцы — інтэрнацыяналізацыя навукі і тэхнікі. Новыя вынаходствы прапануюць новы падыход да вырашэння сацыяльных, філасофскіх, нават асабістых праблем і тым самым уплываюць на штодзённае жыццё краін і народаў. Аднак навукова-тэхнічны прагрэс мае таксама негатыўны бок, які праяўляецца падчас як сляпая стыхійная сіла, што прыводзіць да непапраўных вынікаў. Тым самым чалавецтва пастаўлена перад неабходнасцю адзінства — хаця б з-за агульных для народаў Зямлі праблем, так званых глабальных праблем сучаснасці.

Да першачарговых з іх адносяцца наступныя: пераадольванне экалагічнага крызісу, які звязаны з разбуральным умяшаннем чалавека ў прыроду; прадухіленне войн з прымяненнем зброі масавага паражэння і стварэнне бяз'ядзернага свету; пераадольванне разрыву ў развіцці краін і культур.

Такім чынам, чалавецтва не толькі мае цягу да адзінства: самімі ўмовамі існавання і развіцця яно вымушана пабароць "вірус" этнацэнтрызму і прывесці да "адной роўніцы" — сусветнай культуры (цывілізацыі).

"Ідэя сусветнай цывілізацыі, — піша С.Хантынгтан, — вызначае ў агульных рысах культурнае збліжэнне чалавецтва і пашыранае прызнанне рознымі народамі ва ўсім свеце агульных каштоўнасцей, веравызнанняў, арыентацый, формаў дзейнасці і інстытутаў" (3, с. 511). Якой жа будзе гэтая сусветная цывілізацыя?

Ці не будзе яна сілай, нівеліруючай своеасаблівасць этнічных і нацыянальных культур, якой доўгі час з'яўлялася культура Захаду ў адносінах да іншых цывілізацый?



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К канцу XX ст. тэндэнцыя аднаскіраванага ўплыву якой-небудзь цывілізацыі на астатнія змянілася на супрацьлеглую — да ўзаемаразумення раўнапраўя бакоў усіх цывілізацый. Сусветная цывілізацыя магчыма толькі як поліцывілізацыйная сістэма, як універсальная цэласнасць, якая валодае рысамі не імперыі, а хутчэй канфедэрацыі.

Чалавецтва пашырае сферу свайго існавання. Але чалавецтва — гэта не што іншае, як народы, і ў гэтым залог адначасова цэласнасці і разнастайнасці свету. Толькі адзін магчымы варыянт рэальнага станаўлення і росквіту — адзінства ў адрозненні. У якасці фундаменту планетарнай культуры неабходны пэўны маральны код, маральныя прынцыпы і каштоўнасці, якія ўспрынялі б усе народы.

Думаецца, перадумовы да вызначэння такіх каштоўнасцей можна знайсці, таму што ўсе цывілізацыі, нацыі, этнасы складаюцца з людзей, аб'яднаных агульнай прыродай, а таксама імкненнем да планетарнага культурнага адзінства, якое ўсё ўзрастае.


1. *Бахтин М.М.* Эстетика словесного творчества. — М., 1979. — 424 с.

2. *Одиссей.* Человек в истории / Ю.Н.Афанасьев, Л.М.Баткин и др. — М., 1989. — 198 с.

3. *Сравнительное* изучение цивилизаций: Хрестоматия / Сост., ред. и вступ. ст. Б.С.Ерасова. — М., 1998. — 556 с.

4. *Pro et Contra:* Альманах. — М., 1997.



**І.А.Алексніна,**
*ст. выкладчык*


## ПАРАТЭАТРАЛЬНЫЯ ФОРМЫ ТВОРЧАСЦІ Ў СІСТЭМЕ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Сістэму мастацкай культуры любога народа можна ўмоўна падзяліць на дзве асноўныя састаўныя падсістэмы: духоўную і матэрыяльную. Такі падзел, бясспрэчна, умоўны, таму што матэрыяльны і духоўны пачаткі знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі паміж сабой і аказваюць адзін на аднаго моцнае ўздзеянне і ўплыў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ